— Калі б ваш чытач паведаміў назву пункта грамадскага харчавання, можна было б правесці праверку, а так магчыма паразважаць толькі ўвогуле. Найперш трэба сказаць пра свабоднае цэнаўтварэнне: урад кантралюе цэны толькі на сацыяльна значныя тавары. Зноў жа, трэба ведаць калькуляцыю (якая сыравіна, тая ж кава, паступіла, колькі вады, цукру, колькі выдаткавана электраэнергіі і інш.) Пры прыгатаванні кавы выкарыстоўваюцца спецыяльныя апараты, якія мы арандуем, а яны могуць быць запраграмаваныя і на 5, і на 6, і на 7,5 грамаў кавы. А цукру колькі было, зноў запытаю? — распавёў Уладзімір Іванавіч. — Дарэчы, гэтую самую калькуляцыю ваш чытач мог папрасіць паказаць сам прама на месцы. Да таго ж трэба ведаць, да якой катэгорыі адносіцца пункт грамадскага харчавання, паколькі ад гэтага залежыць і ўзровень нацэнкі. А ён можа быць розным — ад 70-90 і да 250 працэнтаў. Напрыклад, нашы міні-кавярні, што месцяцца на прывакзальнай тэрыторыі, маюць другую катэгорыю. Заводская сталоўка, пра якую кажа грамадзянін, мае, як можна меркаваць, трэцюю катэгорыю, адпаведна, і нацэнка там самая мінімальная.

Сяргей РАСОЛЬКА.

4 сакавіка

Дзве даты

1634 год — нарадзіўся Казімір Лышчынскі, беларускі мысліцель-атэіст і матэрыяліст. Адмаўляў існаванне Бога і лічыў рэлігію свядомым ашуканствам. Свае думкі і ідэі выкладваў у форме лагічных доказаў. За рукапісны трактат «Аб неіснаванні Бога» быў асуджаны да смяротнага пакарання — у 1689 у Варшаве Казіміра Лышчынскага абезгаловілі і спалілі на вогнішчы.

1880 год — у амерыканскай газеце «Нью-Ёрк дэйлі графік» надрукавана першая рэпрадукцыя фотаздымка.

Цытата дня

«Сціплы не той, хто раўнадушны да пахвальбы, а той, хто ўважлівы да крытыкі».

Жан Поль (1763—1825), нямецкі пісьменнік.

Днямі ў рэдакцыю з пытаннем-прапановай звярнуліся нашы даўнія чытачы — Марыя Сцяпанаўна з Брэстчыны і спадарыня Алена з Гродзенскай вобласці. У жанчын дзеці вучацца ў Мінску. Сталіца студэнтам вельмі спадабалася, ды і бацькі не супраць, каб яны засталіся жыць Мінску. Пытанне толькі за жыллём. Нейкія грошы ў гэтых сем'ях ёсць, аднак не хапае інфармацыі аб тым, як лепш і якім чынам сродкі перавесці ў квадратныя метры. Марыя Сцяпанаўна чула, што Мінск стаў бадай закрытым горадам і пабудавацца тут звычайнаму чалавеку ўжо нерэальна...

СТАЛІЧНАЕ ЖЫЛЛЁ БУДЗЕ ТАННЕЦЬ І НАДАЛЕЙ

Што ў гэтым выпадку можна параіць нашым падпісчыцам, карэспандэнт «Звязды» высвятляў сумесна з кіраўніком агенцтва «БелЦТН», старшынёй савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалаем ПРАСТАЛУПАВЫМ.

Старыя «хрушчоўкі» — танней, а новае жыллё — лепш і перспектыўней

Наш эксперт Мікалай Паўлавіч параіў бы канчаткова вызначыцца патэнцыяльным кліентам па двух галоўных пытаннях: з якой мэтай набываецца жыллё; для каго і па якім аптымальным кошце яно купляецца? Зразумела, што на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сёння магчыма адшукаць аднапакаёвыя «хрушчоўкі» з агульнай плошчай да 30—33 квадратных метраў. Сёння гэта на рынку самае таннае жыллё коштам да 40—43 тысяч долараў. Самая маленькая аднапакаёвая кватэра ў новабудоўлях мае агульную плошчу не менш за 43—46 квадратных метраў. Такое жыллё нават у панэльных дамах каштуе ўжо больш. Увогуле, старыя «хрушчоўкі» маюць толькі адзін плюс — малая цана. Жыць у такіх кватэрах працяглы час маладыя людзі ўжо не згодныя.

Калі кватэра купляецца ў якасці часовага жылля на 4—5 гадоў вучобы, то і тут «хрушчоўкі» з'яўляюцца не самым лепшым выбаткам. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што «хрушчоўкі» ў старых дамах не будуць сур'ёзна даражэць нават з цягам часу — калі рынак жыллёвай нерухомасці ажыве. А вось кватэры ў новабудоўлях потым будуць даражэць, аднак... Тут існуе адно «але». Справа ў тым, што кватэры, якія ўзводзяцца па лініі долевага будаўніцтва для нечаргавікоў, прапануюцца кліентам без поўнага аздаблення. А вось каб давесці такое жыллё да таварнага ладу, неабходна ўкладваць сапраўды сур'ёзныя грошы. Толькі ў гэтым выпадку інвестыцыі ў жыллё могуць прынесці часовым уладальнікам нейкі даход, калі кватэру потым выраша-шаць прадаць.

Не згодзен наш эксперт з чуткамі аб тым, што Мінск стаў закрытым горадам. Пэўныя абмежаванні існуюць толькі па будаўніцтве жылля з выкарыстаннем механізмаў дзяржаўнай падтрымкі. І справа тут не толькі ў наяўнасці прапіскі ці рэгістрацыі. Цяпер, каб стаць на ўлік таму, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў беларускага мегаполіса, грамадзяніну трэба мець рэгістрацыю на працягу 5 гадоў. Праўда, і потым, ужо ў чарзе, давядзецца чакаць не адзін год.

Для набыцця кватэр на другасным рынку сталічнай нерухомасці, а таксама па механізме долевага будаўніцтва ніякай рэгістрацыі ў сталіцы грамадзянам Беларусі не трэба.

Танныя кватэры ўжо «павымываныя», але бываюць выпадкі

Мікалай Прасталупаў адзначае, што на сталічным рынку жылля на працягу трох месяцаў назіраецца стабільная актыўнасць кліентаў, якія цікавяцца прапановай і набываюць кватэры. Аднак купляецца недарагое ці «сярэдняе» жыллё, а менавіта кватэры ніжэйшага цэнавога дыяпазону. А вось сапраўды танных кватэр ужо амаль не існуе. Адшукаць нават зусім «слабенькую» па якасці аднапакаёвую «хрушчоўку» на крайніх паверхах старых пяціпавярховых дамоў да 40 тысяч долараў стала праблематычна. Мінімальны кошт маленькіх аднапакаёвак трапіў у дыяпазон 40—45 тысяч долараў. Аднапакаёвыя кватэры агульнай плошчай да 40 квадратных метраў у дзевяціпавярховых панэльных дамах спальных раёнаў прапануюцца за 48—53 тысячы долараў. Даражэйшыя кватэры са стандартнай плошчай «немаладых» аднапакаёвак попытам увогуле амаль не карыстаюцца.

Мінімальны кошт «слабых» па якасці двухпакаёвых кватэр па базе звестак прапановы складае сёння 49—54 тысячы долараў. Гэта «хрушчоўкі» ў старых пяціпавярховых дамах з агульнай плошчай да 46—48 квадратных метраў. Крыху большыя па плошчы двухпакаёвыя кватэры ў дзевяціпавярховых дамах каштуюць ад 55 да 67 тысяч долараў.

На першы погляд, узнікае ўражанне, што кошт прапановы летась у снежні дасягнуў сваёй магчымай мінімальнай мяжы, а зараз назіраецца стабілізацыя, а потым кватэры могуць нават даражэць. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што гэта звычайная ілюзія стабілізацыі пасля працяглага «вымывання» з рынку вельмі танных няякасных кватэр. На рынку час ад часу зноў з'яўляюцца танныя маленькія кватэры, якія купляюцца тымі кліентамі, што своечасова пакінулі свае заяўкі ў агенцтвах нерухомасці.

Вясной — хісткая раўнавага, а летам чарговае патанненне

Цяпер на сталічным рынку жыллёвай нерухомасці склалася такая сітуацыя, калі аднапакаёвыя і двухпакаёвыя кватэры прадаюцца толькі ў тым выпадку, калі квадратны метр у такіх памяшканнях каштуе ў межах 1200—1350 долараў. Аднак сярэдні кошт прапановы на рынку зараз фіксуе крыху іншы цэннік, які для аднапакаёвак складае 1450 долараў, а для двухпакаёвых кватэр — 1410 долараў за квадратны метр. Гэта сведчыць аб тым, што вялікая колькасць кватэр выстаўляецца на продаж па завышаным цэнніку. Для таго, каб кватэры, якія прапануюцца, масава прадаваліся, прадаўцы вымушаны будуць згаджацца на пэўныя зніжкі. А для гэтага патрэбен час. Менавіта такое вялае патанненне прагназуе на сталічным рынку да сярэдзіны ліпеня Мікалай Прасталупаў. Наш эксперт лічыць, што патанненне жыллёвага квадрата па лініі долевага будаўніцтва будзе мець нават больш хуткія тэмпы. Справа ў тым, што на першасным рынку жыллёвай нерухомасці сёння назіраецца сур'ёзная канкурэнцыя паміж будтрэстамі, якія займаюцца долевым будаўніцтвам. Тут больш актыўнымі сталі ўдзельнічаць дзяржаўныя будаўнічыя арганізацыі. Пры будаўніцтве панэльных дамоў па далёўцы ўсё часцей арганізатары будаўніцтва прапануюць кліентам жыллё, дзе квадратны метр каштуе да тысячы долараў. Персанальна Марыі Сцяпанаўне і спадарыні Алене Мікалай Прасталупаў параіў не спяшацца пры набыцці любога па якасці жылля для сваіх дзетак. Лепш сёння падаць заяўку ў агенцтва і дачакацца свайго варыянта, або прыняць рашэнне на карысць долевага будаўніцтва новага сучаснага жылля. Справа застаецца за пошукам неабходных фінансаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Погляд

ДЫПЛОМ, ДЫ НЕ ТОЙ

У Беларусі няма студэнтаў, адлічаных з ВНУ па палітычных матывах. Пра гэта неаднойчы заяўлялася на самых розных узроўнях, у тым ліку і былым міністрам адукацыі, цяпер першым намеснікам кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандрам Радзьковым. Умовы адлічэння дакладна прапісаныя ў статутах універсітэтаў і ў палажэннях аб вышэйшай школе. Асноўнай жа рэальнай прычынай адлічэння з'яўляецца бягучая непаспяховасць. Той, хто хоча вучыцца, той, зразумела, вучыцца. Тым часам апазіцыйныя СМІ сцвярджаюць, што «палітычных» навучэнцаў адназначна імкнуцца пазбавіцца, — ці адразу, як тыя «трапіліся», ці праз нейкі час. Такіх ахвяр, а таксама наогул усіх іншых ахвотных гатовая падтрымаць праграма К. Каліноўскага ў Польшчы і Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, галаўны офіс якога размяшчаецца ў Літве.

Студэнтаў, якія выказваюць жаданне скарыстацца падобнымі прапановамі, не так і многа. Тым не менш няхай сабе і дзясяткі маладых людзей, але ж ламаюць сабе лёс, што, вядома, сумна. А ўсё таму, што да таго, як прыняць любую прапанову, тым больш выязную і доўгатэрміновую, варта зазірнуць у будучыню, паразважаць над тым, дзе і кім будзеш працаваць па завяршэнні адукацыйнага працэсу. Ні праграма Каліноўскага, ні ЕГУ не бяруцца, вядома ж, за ўладкаванне на працу беларусаў толькі па той прычыне, што перад імі — палітычныя беларусы. Тут жа, на радзіме, спецыяліст з польска-літоўскім дыпломам тым больш не патрэбны — па цалкам зразумелых аб'ектыўных прычынах. Работадаўцы ўсё роўна аддадуць перавагу выпускніку тутэйшай ВНУ.

Сам працэс навучання ў той жа Польшчы таксама нельга назваць прадуманым з пункту гледжання нашага маладога чалавека, які ў абсалютнай большасці выпадкаў не валодае ні польскай, ні літоўскай мовамі. Вядома, што той бок прадастаўляе магчымасць трапіць на моўныя курсы, аднак наўрад ці можна за прапанаваны кароткі час асвоіць мову настолькі, каб навучацца. З другога боку, пра навучанне варта сказаць асобна, паколькі такая вучоба і сапраўды не патрабуе адмысловых моўных ведаў.

Праграма імя Каліноўскага была ініцыявана ў 2006 годзе, і каардынатарам праекта ў Беларусі стала Іна Кулей, кіраўнік незарэгістраванага Камітэта абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць», жонка экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча. Ад самага пачатку вышэйназваная праграма мела на мэце арганізоўваць стыпендыятам сустрэчы са службовымі асобамі Польшчы, прадстаўнікамі Савета Еўропы і беларускай апазіцыі. Падчас такіх сустрэч абмяркоўваюцца, як правіла, выбарчыя кампаніі ў Беларусі ды неабходнасць правядзення ў рэспубліцы рознага кшталту несанкцыянаваных акцый пратэсту. Шэраг польскіх арганізацый штомесяц ініцыююць правядзенне зборах каля дыпламатычнага прадстаўніцтва Беларусі ў Варшаве. Карацей, займаюцца нашы студэнты на чужыне далёка не разумным, добрым, вечным. Прафесійную падрыхтоўку з поспехам выціскае «экстрэмісцкая спецпадрыхтоўка». Моладзі навязваюць ідэі барацьбы за «незалежнасць», навучаюць прынцыпам змены дзяржаўнага ладу, практыцы «вулічнай барацьбы».

Выплачваюць слухачам праграмы і стыпендыю, што з'яўляецца свайго роду адпрацоўкай заходніх грантаў. Ужо не сакрэт, што апошнія расходуюцца не толькі на выкладанне профільных прадметаў, выплату стыпендый, кампенсацыю за пражыванне ў інтэрнатах, але і на сістэмную ідэалагічную апрацоўку стыпендыятаў, правядзенне бунтарскіх акцый. Аднак далёка не ўсё траціцца на такія «высакародныя мэты». Абсалютную большасць велізарных сум замежных грантаў арганізатары навучання за межамі Беларусі проста кладуць сабе ў кішэні. І на гэта ёсць прамыя доказы — наяўнасць хоць бы той нятаннай нерухомасці, аўтамабіляў і іншых зручнасцяў жыцця, якія і выдаюць нямэтавы расход грантаў.

Мяркуючы па ўсім, праграма, мякка кажучы, не апраўдала сябе. Апошні набор зменшыўся ў параўнанні з першым у чатыры разы. Шэраг беларусаў адлічылі за непаспяховасць, пропуск заняткаў, дысцыплінарную правіннасць, а таксама па ўласным жаданні. Некаторыя студэнты ўхітрыліся і непрыемнасці з законам займець. Што і не дзіўна. Рана ці позна на такія непрыемнасці можа падштурхнуць само жыццё. З заканчэннем вучобы стыпендыя таксама заканчваецца. Калі ж жаданне застацца ў краіне, дзе атрымаў вельмі важныя веды вулічнага процістаяння, да таго часу не знікла, трэба будзе пакруціцца, каб займець сродкі на далейшае пражыванне. А работу, як гаварылася вышэй, праграма Каліноўскага не прадастаўляе.

Замежнікі ўсё часцей сутыкаюцца з адваротным бокам сваёй «дабрачыннасці», паколькі пад палітычным соусам у заходнія краіны едуць не столькі нават ідэйныя беларусы, колькі людзі, якія прагнуць уласнай выгады, а палітычнымі матывамі толькі прыкрываюцца. Так адзін «прадпрымальны» грамадзянін доўгі час атрымліваў адмову на наведванне ЗША. Аднак пасля ўдзелу ў мітынгу 19 снежня з задавальненнем пацірае рукі: маўляў, няхай цяпер толькі паспрабуюць адмовіць — «я ж палітычны»!

Палітычныя матывы, як і любыя іншыя, таксама могуць быць у падмурку бізнэсу. І той, хто пагаджаецца браць удзел у гульнях, звязаных з вялікімі грашыма, дапамагае тым самым некаму няблага зарабіць.

Іван ЧОРНЫ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

■ Оценка оборудования и транспортных средств
■ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
■ Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Сведения о балансодержателе: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8(0232) 79 67 14

№ лота	Наименование объекта аренды и его характеристика	Местоположение объекта аренды	Цель использования объекта аренды	Коэффициенты месторасположения и спроса к базовой ставке (по договору)	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Помещение площадью 177,8 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2,5	1 555 750	155 580
2	Помещение площадью 11,5 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Жлобин, ул. Первомайская, д.76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2,5	100 625	10 100
3	Помещение площадью 15,9 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2,5	139 125	14 000
4	Помещение площадью 61,3 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2,5	536 375	53 600
5	Помещение, состоящее из четырех комнат (10,7 кв.м, 43,2 кв.м, 13,4 кв.м, 6,4 кв.м) общей площадью 73,7 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании УОПП; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Жлобин, ул. Урицкого, д. 41	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2,5	644 875	64 500
6	Помещение, состоящее из трех комнат (23,97 кв.м, 15,02 кв.м, 8,8 кв.м) общей площадью 47,79 кв.м, расположенное на 1-м этаже в помещении отделения почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Мозырь, ул. Нелидова, д. 3а	Осуществление торговли, оказание услуг, размещение складских помещений, офиса	0,6 х 2,5	418 163	41 800
7	Помещение площадью 201,5 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано.	г. Мозырь, ул. Ленинская, д. 34	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2,5	1 763 125	176 300
8	Помещение площадью 65,2 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании гаража; здание без удобств.	г. Гомель, рп. Кастюковка, ул. 9 Мая,1б	Размещение гаража, склада, оказание услуг, производство	0,7 х 1,5	570 500	57 100

Базовая ставка за 1 кв.м арендуемой площади: г. Жлобин и г. Мозырь – 0,25 БВ в рп. Костюковка – 0,3 БВ;

Срок аренды – 5 лет.

При заключении договоров аренды **ставка арендной платы может быть скорректирована** с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 г. № 518 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток до «17» января 2011г. на р/с 3012029970016 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 334, УНН 102353509, ОКПО 55484006. Получатель платежа: Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

Дата проведения аукциона «31» марта 2011 г. в 11.00 в Гомельском областном управлении филиала «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а».

Организатор аукциона: ГОУ филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:

* заявление по установленной форме;

* копии платежного поручения,заверенной банком, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении.

* индивидуальные предприниматели – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

* юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

* юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

* представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

* физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Подача документов по почте не допускается.

Аукцион является открытым. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение 5 рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона будут заключены договора аренды недвижимого имущества.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а» с 9.00 до 17.00 по рабочим дням. **Последний срок подачи документов «30» марта 2011 г. до 17.00.**

Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 11.00 состоится по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а» ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация». Контактные телефоны: (0232) 77 37 27, 77 52 78; 77 52 87.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ И ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Наименование объекта	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3	Лот № 4
Целевое назначение	Установка торгового павильона	Установка торгового павильона	Строительство объекта «Административно торговый комплекс» и летнего кафе-пицерии	Строительство и обслуживание жилого дома
Местонахождения объекта	Г. Малорита, ул. Советская	Г. Малорита, ул. Заслонова	Г. Малорита, ул. Школьная, 12	Малоритский район, д. Луково, ул. Набережная, 17Б
Продавец объекта	Малоритский районный исполнительный комитет			Луковский сельский исполнительный комитет
Организатор торгов	Малороитский районный исполнительный комитет			
Начальная цена продажи, руб.	1091526	1164307	24868055	2112550
Сумма задатка, руб.	109150	116430	2486810	211260
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер	0,0015 га, решение Малоритского райисполкома № 1429 от 23.11.2010, кадастр. номер 125250100001002727	0,0351 га решение Малоритского райисполкома № 1495 от 02.12.2010, кадастр. номер 125250100001002724	0,1999 га решение Малоритского райисполкома № 168 от 09.02.2011, кадастр. номер 125250100001002735	0,1557 га решение Луковского сельисполкома № 1 от 04.01.2011, кадастр. Номер 125281302601000395
Ограничения в использовании земельного участка	В охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи на площади 0,0015 га	В санитарно-защитной полосе водопровода на площади 0,0053 га в охранной зоне воздушной кабельной линии электропередачи напряжением 0,4 кв на площади 0,0054 га		В водоохранной зоне озера Луковское вне прибрежной полосы на площади 0,1557 га
Срок аренды земельного участка	10 лет	10 лет	50 лет	Частная собственность
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)	1844910	1715900	2020900	1483760
Условия продажи	1. Внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка. 2. Возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения. 3. Заключения победителем аукциона с районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения районного исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	1. Внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка. 2. Возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения. 3. Заключения победителем аукциона с районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения районного исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий шести месяцев. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией, но не позднее одного года со дня заключения договора аренды земельного участка.	1. Внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка. 2. Возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения. 3. Заключения победителем аукциона с районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения районного исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	1. Внесения победителем аукциона платы за выкуп земельного участка в частную собственность. 2. Возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка. 3. Осуществления в двухмесячный срок после принятия решения Луковского сельисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на строительство жилого дома. 5. Занятия (освоения) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства о государственной регистрации и прав на него.

Аукцион состоится **11 апреля 2011 года в 11.00** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 64 (малый зал).

Контактные телефоны в Малорите: (8 01651) 2 30 01, 2 23 65, 2 30 04.

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602223000219 ЦБУ № 120 АСБ «Беларусбанк» МФО 150501246, код платежа 04002, получатель платежа – районный бюджет, УНН 200077623.

3. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина* или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников

* Для аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства жилого дома

Заявления об участии в аукционе принимаются по 5 апреля 2011 г. (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 57, отдел экономики Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Па гарызанталі: Архітэктар. Мейр. Чуб. Дзян. Зона. Урок. Арфа. Мекі. Сандалеты. Расклад. Кут. Жэва. Гербера. Бур. Цэл. Сята. Маліна. Вам. Тэкст. Дыстанцыя. Камбінат. «Кодак». Дзярн. Сігнал. Афіна. Яга. Пярэпёлка. Лубасцяжа. Мак. «Урга». Томск. Лес. Канупеці. Кат. Рэнта. Цвіл. Рана. Тэтчэр.

Па вертыкалі: Прагэст. Засуп. Юпітэр. Віяак. Бухта. Бэра. Гандаль. Дыстанцыя. Камбінат. «Кодак». Дзярн. Сігнал. Афіна. Яга. Пярэпёлка. Лубасцяжа. Мак. «Урга». Томск. Лес. Канупеці. Кат. Рэнта. Цвіл. Рана. Тэтчэр. Сакат. Паказа. Скіп. Ігрота. Удар. Пярэпёлка. Фрак. Кіпцюр.

АДКАЗ НА СКАНВОРД

Жарсці па Еўрабачанні

Анастасія ВІННІКАВА: «КАР'ЕРУ СПЯВАЧКІ МНЕ ПРАДКАЗАЎ СВЯТАР»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 3 сакавіка.)

«Першым у мяне паверыў Раінчык»

Першае выступленне на вялікай сцэне ў Анастасіі Віннікавай адбылося ў студзені мінулага года — спявачка выступала на адкрыцці «Мінск-Арэны».

— 15 тысяч гледачоў і жывы гук — баявое хрышчэнне адбылося, — усміхаецца дзяўчына і дадае: — Я думала, насамрэч так не бывае. Ва ўніверсітэце я выпадкова апынулася на праслухоўванні. Пазней было другое праслухоўванне з удзелам Васіля Пятровіча Раінчыка. Гэта быў першы чалавек, які паверыў у мяне і дапамог зрабіць першыя прафесіянальныя крокі ў музыцы.

Між іншым, кар'еру спявачкі, як зазначае сама дзяўчына, ёй напрарочылі яшчэ ў маленстве — і не абы-хто, а праваслаўны святар:

— Калі мне было чатыры месяцы, бацькі вырашылі мяне хрысціць. Хрост адбываўся ў саборы Пятра і Паўла ў Гомелі. Усе дзеці, якія там былі, маўчалі, а я — спявала. Айцец Георгій спытаў у хроснага, як мяне завуць, і сказаў: спявачкай будзеш, Анастасія. І акрапіў вадой.

Сёння за плячыма ў Насці — удзел у музычных праектах АНТ «Музыкальны суд» і «Эстрадны кактэйль». Навіна пра «Еўрабачанне» стала для дзяўчыны прыемнай неспадзяванкай.

— Першымі пачалі віншаваць сябры: званілі, пісалі смс-кі. Ад такой колькасці я, прызнацца, была збянтэжаная. Сёння яшчэ рана рабіць нейкія прагнозы, але я люблю сваю краіну і зраблю ўсё для таго, каб выступіць годна. Кіруюся толькі гэтым.

Што за песня і хто аўтары?

Кампазіцыя, выбраная фокус-групай для Дзюсельдорфа, была напісаная Віктарам Рудэнкам (словы) і Яўгенам Алейнікам (словы і музыка). Упершыню песня прагучала ў трэцім сезоне праграмы «Музычны суд» на АНТ, але ў фінал праекта яна не выйшла.

— Тэкст песні пісаўся зусім не для Еўрабачання, — тлумачыць **аўтар слоў Віктар РУДЭНКА**. — Гэта больш шаржавая кампазіцыя. Я меркаваў, што найперш яна будзе выклікаць усмешку, а не якімсьці чынам прэзентаваць краіну на міжнародным узроўні. Пад той варыянт тэксту, які мы чулі, можна, напрыклад, уявіць, як беларускія парламентарыі ідуць браць рэйхстаг, альбо як дзяўчынка з зорачкай акцябронка а-ля Лаліта выконвае кампазіцыю, а на заднім плане — хор геяў... Таму тэкст мы вырашылі перапрацаваць.

Дырэктар дырэкцыі спецпраектаў тэлеканала «АНТ» Анжэліна Мікульская, якая ўваходзіла ў тую самую фокус-групу, запэўніла журналістаў, што прадстаўнікі фокус-групы выбіралі найперш песню:

— Мы выбіралі найперш песню, а не спевака. Тэкст у кампазіцыі жартоўны, і мы разумеем, што некаторыя нюансы еўрапейскай публіцы будуць незразумелыя. У новым варыянце мы будзем шукаць моманты, якія больш станоўча ахарактарызуюць Беларусь і будуць зразумелыя еўрапейскім гледачам.

— Асноўным жартам песні «Born in Belorussia» з'яўляецца тое, што Насця некаторы час яшчэ паспела пажыць у Савецкім Саюзе, — тлумачыць сваё бачанне песні **кампазітар Яўген АЛЕЙНІК**. — Мы хацелі абыграць гэты момант і думалі, што будзе цікава. Ніхто ніякім чынам не хацеў перайначваць назву нашай краіны Republic of Belarus. Ніхто не плануе, што гэтая песня пройдзе на Еўрабачанне. Таму зараз яна будзе вельмі сур'ёзна дапрацоўвацца. У выніковым варыянце тэкст песні стане больш лірычным, а напісанне нашай краіны будзе прыведзенае ў адпаведнасць з сучаснымі арфаграфічнымі нормамі. Хутчэй за ўсё, новая песня атрымае назву «Я — беларуска».

А па-беларуску слабо?

— Я хачу перакласці песню на беларускую мову і буду прапаноўваць варыянт гэтай песні як канчатковы, — адказаў на пытанне «Звязды» Яўген Алейнік. — Беларускамоўная песня магла б прынесці нам дадатковыя балы ад краін-суседак. Але тут ёсць і свае нюансы: у нашым паўфінале з блізкіх суседзяў толькі Украіна і Латвія, таму пры дапрацоўцы песні будзем зыходзіць выключна з кан'юнктуры галасавання.

Сама спявачка Насця Віннікава прызналася «Звяздзе», што вельмі любіць беларускую мову:

— Вельмі люблю спяваць па-беларуску. У маім рэпертуары нават песень на рускай няма: тры на англійскай і дзве на беларускай. Таму, калі будзе прынятае такое рашэнне, я буду толькі рада.

Але магчымае выступленне з беларускай песняй можа стаць не адзіным сюрпрызам ад беларусаў. Паводле слоў **галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі Першага канала Аляксандра КАПЁНКІНА**, цалкам магчыма, што і каментарый да трансляцыі таксама будзе беларускім:



Беларускае трыа: Яўген АЛЕЙНІК, Анастасія ВІННІКАВА і Віктар РУДЭНКА.

— Мы думаем над тым, каб зрабіць каментарый на беларускай мове. Падобны вопыт у нас ёсць — трансляцыя «Грэмі». Але сёння мы яшчэ думаем, хто будзе каментаваць, на якой мове (*не выключана і двухмоўнае каментаванне* — **І.Л.**), і хто будзе аб'яўляць ад Беларусі балы.

Што далей?

Які нумар рыхтуюць беларусы? Ці чакаецца змяненне стылю спявачкі? Хто будзе фінансаваць падрыхтоўку? Не на ўсе пытанні сёння ёсць адказ.

Па словах арганізатараў, на сёння для Насці прапанавана 25 вобразаў, але які з іх будзе абраны, казаць рана. Прынамсі, па дапамогу да замежнікаў творчая каманда звяртацца не плануе.

Хто такая Анастасія Віннікава?
Нарадзілася 15 красавіка 1991 года, адна дачка ў сям'і. Бацька — падпалкоўнік у адстаўцы, маці — дацэнт, кандыдат псіхалагічных навук, загадчык кафедры БДПУ імя М. Танка. Анастасія скончыла беларускую гімназію ў Дзяржынску, займалася на харавым аддзяленні Дзяржынскай школы мастацтваў. Сёння дзяўчына — студэнтка 2 курса перакладчыцкага факультэта Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, вывучае англійскую і іспанскую мовы.

— Мы можам канкурыраваць пры выпуску праграм, але што датычыць «Еўрабачання», то Першы канал і «АНТ» працуюць у адной камандзе, — гаворыць Анжэліна Мікульская. —Дзяржаўныя грошы ні летаць, ні сёлета скарыстаныя не былі. За ўсё плаціў тэлеканал «АНТ». Усімі арганізацыйнымі момантамі, звязанымі з паездкай, нумарам і стылем спявачкі, зойменца творчая група АНТ, за трансляцыю конкурса адказвае Першы канал. Нам бы вельмі хацелася стварыць цалкам беларускі прадукт. Яўген — адзін з самых вопытных, здольных і таленавітых кампазітараў нашай краіны. Таму яго песню мы і выбралі.

— Я настойваю і вельмі хачу, каб прадукт быў падрыхтаваны цалкам у нашай краіне, — працягвае Яўген Алейнік. — У песні не зменіцца ніводнай ноты — зменіцца падача матэрыялу. Я лічу, што ў нас усё атрымаецца. Мая мэта — каб песня беларускага аўтара выйшла ў фінал. І хачу, каб так і адбылося.

— А Насця Віннікава — гэта рэдкі голас і рэдкія здольнасці, — заключае Анжэліна Мікульская. — Гэта тая выканаўца, якая стане адной з прым беларускай эстрады.

Ілья ЛАПАТО.

А як у суседзяў?

Ва ўкраінскім адборы перамагла спявачка Міка Ньютан, перавагу аддалі ёй, нягледзячы на тое, што ў адборы прымалі ўдзел пераможца «Новай хвалі-2009» спявачка Джамала і ўжо вядомая па выступленні на «Еўрабачанні» Анастасія Прыходзька.

Расія яшчэ не вызначылася з выканаўцам. Па чутках, краіну можа прадставіць спявачка Глюкоза альбо вакальны ансамбль «Бураначскія бабулі», які стаў прарывам на леташнім адборы. Між іншым, сваю заяўку падалі таксама кіпрыёт Аўраам Русо, украінка Джамала, а таксама дуэт Дзімы Білана і Сяргея Лазарава.

КАМПЕТЭНТНА

«Масленка прыцягвае шмат турыстаў, але ўзровень сэрвісу пакідае жадаць лепшага»

— Масленка ў нас ідзе ўвесь люты і сакавік, — расказвае Алесь Кушнер, дырэктар турыстычнага агенцтва «Гісторыя-Тур», аднаго з ініцыятараў свят у Азярцы і Заслаўі. — Зараз раскуплены ўсе туры ў Заслаўе. Цікавяцца імі як беларусы, так і замежнікі. Аднак праблема ў тым, што ў нас практычна адсутнічаюць атэлі эканом-класа, нават у Мінску. А ў раёнах, калі гэта і прымальна па кошце, то не хапае месцаў, каб рассяліць нават сярэднюю групу чалавек 40. Таму і даводзіцца вяртацца з месца ад'езду. А гэта ўсе выліваецца ў кошт тура. Уявіце, што такое, завезці людзей у Полацк і вечарам вярнуцца назад... Аналагічная праблема і з харчаваннем, калі ў буйных турыстычных кропках адкрываюцца корчмы, то ў дробных іх няма... А гэта стварае пэўныя перашкоды для турыстычнага бізнэсу... Хоць нейкія захады і робяцца, але пакуль праблемы існуюць.

На Масленку трэба есці столькі разоў, колькі варона махне крылом

Блінцы з розным начыннем (ад мёду і да ікры), забаўкі і штодзённыя гасцяванні — нашы продкі адзначалі Масленку (менавіта так свята называлася на Беларусі) ад душы. Нездарма стагоддзе-два таму хадзіла прыказка: «Хоць сябе закладзі, а Масленку спраў». Даведацца пра масленічныя традыцыі беларусаў у Заслаўе ды Азярцо разам з кітайцамі выправілася Настасся Занько.

«Масленка прыйшла, вясну прывяла»

Масленку ў Заслаўскім гісторыка-культурным запаведніку давялося святкаваць разам з кітайцамі. Група замежных студэнтаў з розных ВНУ вырашыла спрычыніцца да беларускіх традыцый. Кітайцы са здзіўленнем разглядалі адзіны паравы млын на Беларусі і фатаграфавалі яго на мабільныя тэлефоны. Потым захіналіся ад пранізлівага ветру, пакуль Канстанцыя, «гаспадыня» дома завозніка (мястачковай гасцініцы, дзе здароўваліся сяляне з суседніх вёсак) у святочным народным строі вітала гасцей сваімі песнямі. За 2,5 гадзіны арганізатары абяцалі паказаць увесь тыдзень Масленкі.

— На першы дзень Масленку сустракалі, — распавядае Канстанцыя. — У гэты дзень спявалі масленічныя песні, рабілі вялікую ляльку-Масленку, якую напрыканцы тыдня спальвалі, каб з попелам сышлі грахі і ўсякае зло разам з зімовымі маразамі.

У некаторых вёсках першы блін, які спякла гаспадыня, аддаваўся людзям у галечы і нястачы, каб тыя памянулі нябожчыкаў. У гэты ж дзень нявестка выпраўлялася да сваіх бацькоў з самага ранку, каб дапамагчы прыгатаваць ежу для свякроўкі ды свёкра, якія вечарам прыйдуць у госці. Не спяшаючыся, яны сядуць за стол. Будуць ласавацца блінцамі ды вырашаць, хто да каго і ў які дзень на прысмакі прыйдзе.

Халасцякам калоду да нагі прывязвалі

У аўторак беларусы жартавалі. Халасцякам, бабылям тады праходу не давалі. Яны нават на двор паказвацца баяліся.

— Хто з вас халасцяк? — праз перакладчыка пытаецца ў кітайцаў Канстанцыя. Адарваўшыся ад прыгожай кафлянай печкі, некалькі хлапцоў уздымаюць рукі.

— Адкупляйцеся, даражэнькія. За тое, што яшчэ пару не прыдбалі, — усміхаецца Канстанцыя. — Грашыма, каўбасамі, блінцамі ды цукеркамі...

Перакладчыкі на працягу дзесяці хвілін тлумачаць хлопцам, што ад іх хочуць. У рэшце рэшт нехта аддае гадзіннік, нехта тэлефон, а двое застаюцца.

— Ну, мае родненькія, — працягвае Канстанцыя. — Тады вось вам медаль за такія заслугі.

І на шыю кітайцам вешаюць палена на стужцы. Яны глядзяць са здзіўленнем на ўсіх, не разумеючы, да чаго гэта. А пасля тлумачэнняў пачынаюць гучна смяяцца.

— Беларускім халасцякам у вёсках не тое што палена на вяроўцы на шыю вешалі, але нават і калоду да нагі ланцугом прывязвалі і на замок замыкалі. — апавядае гаспадыня. — А ўсё з-за таго, што Масленіца лічылася самым часам, каб маладыя прыгледзеліся адно да аднаго, знайшлі сабе пару, «каб да Юр'я пабраціся» (6 мая). Ушаноўваліся маладыя пары, да іх наведваліся госці і віншавалі. Хто толькі-толькі пабраўся шлюбам, мог нават цалавацца на людзях, але пад наглядам бацькоў.

«З'еў ён сала пудзік, аж вырваўся гузік»

— У сераду аж стол гнуўся ад ежы. Беларусы на вёсках казалі, што есці на Масленку патрэбна столькі разоў, колькі варона махне крылом ці сабака хвастом, — апавядае Канстанцыя. — Беларуская душа гуляла на вёсцы катушку. Елі шмат і што называецца «ад пуза». Нават прыпёўкі хадзілі: «З'еў сала пудзік, аж вырваўся гузік» ці «Блін не клін — бруха не распора». Бліны патрэбна было ласавацца ад ранку і да вечара. І якога начыння ў іх толькі не было: мёд, тварог, сыр, варэнне, капуста, ікра, рыба і г.д. А таксама піражкі з ляшнымі арэхамі і гарбузікамі (мяса ў гэты тыдзень есці не дазвалялася) і г.д. Быў і «збіцень» — своеасаблівы «кампот» з сушаных ягад ды зёлак...

Канстанцыя і яе «сяброўкі» спяваюць песні пра вырваны гузік з сарочкі ды штанцоў. І неўзабаве прыносяць духмяныя бліны з вішнёвым варэннем. Бліны кітайцам спадабаліся, уміналі іх без адзінага гуку.

У некаторых вёсках, як і ў Расіі, у гэты дзень цешча запрашала зяця на бліны. Ён павінен быў прыйсці ды пасяваць сваё імя, якое павінна супасці з іменем будучага мужа.

Яшчэ, калі збіраліся за адным сталом нежанатыя ды незамужнія. І вось тут ужо дзяўчаты па блінах вызначалі, што за характар у хлапцоў. Лічылася, бліны з ікрой любяць сапраўдныя мужчыны. Па гаспадарцы ён будзе цягавітым і ўсё ў дом прыносіць стане. Аднак вось пяшчоты ды слоў ласкавых ад яго не дачакаешся.

Прабачэння прасілі спачатку ў самага старога

Праводзілі Масленку ў суботу ўвечары. Разам з саламяным пудзілам згаралі, па старажытным павер'і, усе маразы і надыходзіла вясна.

— У апошні дзень Масленкі бацька сядаў на куце. І ўсе дзеці, а таксама ўнукі падыходзілі да яго па чарзе і прасілі прабачэння, — расказвае Канстанцыя. — А пасля бацька таксама прасіў прабачэння ў кожнага.

Увогуле, гэты дзень яшчэ называўся «загвіны» ці «запускі». «Ідзе пост вялікі на бульбу і квас, хавай чаравікі, лапцёй ёсць запас», — спявалі нашы продкі ў нядзелю.

— Вельмі спадабалася, праўда, — казалі госці з Кітая на развітанне. — Прыедзем яшчэ.

«Маразуля» на Масленцы ў Азярцы

На Масленку ў Музей народнай архітэктуры і побыту, што ў Азярцы, патрапілася ехаць з рускімі.

— Хто яшчэ лічыць, што беларуская мова — дыялект рускай? — праз пятнаццаць хвілін аповеду па-беларуску спытаўся экскурсавод. — Для тых я магу працягнуць аповед па-беларуску.

Аднак піцерцы ды масквічы адмоўна заківалі галовамі.

Музей народнай архітэктуры і побыту — унікальны свет. Некалькі кіламетраў ад горада — і ты пераносішся на некалькі стагоддзяў у мінулае. Драўляныя хаты, крытыя чаротам, млыны, свірны і ўніяцкія цэрквы, шырокія вуліцы і рассыпаныя будынкі. І цішыня... Толькі рыпенне снегу і іголкі марозу на шчоках. Пасля шумнага Мінска адчуваеш, што ў цябе закладзены вушы.

У адрозненне ад Заслаўя, акцэнт тут робіцца толькі на сустрэчы і правады Масленкі.

Памерацца сілай можна, перацягваючы канат. Можна залезці на слуп, на якім вісяць прызы, паспрабаваць рассекчы яблык у конкурсе «п'яны кат», пакатацца на сярэднявечных лыжах.

Як аказалася, катацца на гэтых лыжах досыць няпроста: трое павінны сінхронна рухаць нагамі, каб хоць неяк перасоўвацца. А галоўны «сакрэцік» — можна трымацца за плечы адно аднаго.

Танчыць «Маразулю» ды «Ойру» можна было пад жывую музыку «Старога Ольсы». Сонца, мароз ды гарачыя бліны. Беларускі каларыт Масленкі спадабаўся і экскурсійнай групе з Расіі.

— Вельмі добра, — з захапленнем расказвае Эдуард з Санкт-Пецярбурга. — Нас сюды запрасіла сяброўка,. Мы ўвогуле першы раз у Беларусі, і вось так на Масленіцу патрапілі. І рыцары, і Маразуля... А больш за ўсё мне спадабалася самагонка ды свежы хлеб у карчме... На наступны год спадзяёмся прыехаць ізноў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і Таццяны ПРУС.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.52	17.52	11.00
Віцебск —	6.43	17.40	10.57
Магілёў —	6.42	17.42	11.00
Гомель —	6.37	17.40	11.03
Гродна —	7.07	18.07	11.00
Брэст —	7.06	18.09	11.03

Месяц

Маладзік у 22.46.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Архіпа, Багдана, Макара, Максіма, Фёдара, Філімона, Фядота, Яўгена.*

К. *Люцыі, Казіміра, Яўгена.*

Усміхнемся

Дзяўчына — сяброўцы:

— А заляцаецца як прыгожа, якія словы знаходзіць, якія кветкі прыносіць! Проста хоць не выходзь ніколі за яго замуж!

☺

Калі вы хочаце, каб ваша дзіця штодня прымала ванну, падарыце яму воданепранікальны гадзіннік.

☺

Кактэйль «Тры парасяці»: скрыня гарэлкі, два таварышы.

☺

Жонка — мужу:
— Калі б ты ведаў, як мне хочацца чорнай ікры!
— Дык купі слоік кабачковай. Зверху яна заўсёды чорная.

☺

Бабка, якая ўбачыла вольнае месца ў аўтобусе — самы хуткі чалавек на планеце!

Аглядальніка газеты «На страже» **Міхаіла Васільевіча РОЗУМА** віншуем з 60-гадовым юбілеем! Жадаем моцнага здароўя, шчасця, поспехаў і плённай працы!

Сябры і калегі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, С.ГРЫБ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1073. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12